Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 ЛІСТАПАДА 2015 г. ПЯТНІЦА № 230 (28088) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**«Нёман» – аднагодка Перамогі**

СТАР. 3



**Фільмы Пташука, якія варта паглядзець**

СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

# Час і асоба

## Сувораўцы — не толькі героі карцін вядомага мастака Мікалая Апіёка, а і прыхільнікі яго творчасці

**Калі глядзіш на гэтыя палотны, перад вачыма паўстаюць цэлыя эпохі. У чарговы паход ідзе Усяслаў Чарадзей, стварае свой крыж Лазар Богша, пакарае алімпійскія вяршыні Дар'я Домрачава... Ля іншых карцін пахне хлебам, толькі што скошанай травой, свежымі кветкамі. Раптам адчуваеш увесь той жах, што прынесла Вялікая Айчынная вайна, і становішся сведкам падзей у сучаснай арміі.**



СТАР. 13

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

*ЛІЧБА ДНЯ*

**2 млн 569,9 тысячы**

*пенсіянераў знаходзіліся на ўліку ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў кастрычніку гэтага года, пра што паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Сярэдні памер пенсій у кастрычніку склаў Br2 млн 811,1 тысячы, што ў 2,4 раза перавышае бюджэт пражытачнага мінімуму для пенсіянераў (у адпаведнасці з пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, БПМ для пенсіянераў у цэнах чэрвеня 2015 года ў разліку на месяц на перыяд з 1 жніўня па 31 кастрычніка гэтага года складае Br1 млн 193,2 тысячы). Сярэдні памер прызначаных пенсій да сярэдняга памеру налічанай заработнай платы ў кастрычніку бягучага года склаў 41,1%.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.11.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 18266,00 | ▲ |
| Еўра | 19373,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 278,10 | ▲ |
| Укр. грыўня | 782,86 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ На слыху

## АХОВА ЗДАРОЎЯ Ў ЭЛЕКТРОННЫМ ВАРЫЯНЦЕ

### Камп'ютарызацыя працоўных месцаў урачоў, магчыма, завершыцца ўжо налета

**Пакуль жа ў сталіцы амбулаторныя і стацыянарныя медустановы аснашчаны камп'ютарамі, сканерамі і іншай неабходнай тэхнікай прыкладна на 85 працэнтаў, у рэгіёнах — на 50. Як толькі працэс інфарматызацыі поўнасцю завершыцца, можна будзе гаварыць аб пераходзе на электроннае вядзенне ўсёй медыцынскай дакументацыі.**



Паводле слоў **загадчыка аддзела арганізацыйна-метадычнага і сістэмна-тэхнічнага суправаджэння інфарматызацыі аховы здароўя Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра медыцынскіх тэхналогій, інфарматызацыі, упраўлення і эканомікі аховы здароўя Сямёна ПАЛЯКОВА**, камп'ютарызацыя медустаноў, наяўнасць электроннай дакументацыі, электронных амбулаторных картак (дзе будзе сабрана ўся інфармацыя аб пацыенце) з'яўляецца не адзінай задачай электроннай аховы здароўя краіны.

СТАР.3

■ Надвор'е

## МОКРЫ СНЕГ І ДОЖДЖ

### А ўначы сіноптыкі прагназуюць да мінус 12

**Даволі няўстойлівае надвор'е чакаецца на тэрыторыі краіны ў гэтыя выхадныя, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра Мінпрыроды.**

У пятніцу захаваецца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску і істотных ападкаў не чакаецца. На асобных участках дарог галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе ў межах ад мінус 4 да плюс 2 градусаў. Амаль не будзе ападкаў і ў суботу, толькі ўдзень у крайніх заходніх раёнах краіны з набліжэннем атмасфернага фронту пройдуць невялікія ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі слабы галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да мінус 10 градусаў, месцамі па ўсходзе да 10-12 марозу. Максімальная тэмпература ўдзень складзе 2 градусы цяпла.

А вось у нядзелю надвор'е сапсуецца. Пад уплывам актыўных атмасферных франтоў, якія рухаюцца да нас з боку Карпат, часам будуць ісці ападкі (снег, мокры снег і дождж), месцамі наліпанне мокрага снегу, галалёд. Тэмпература паветра ўначы чакаецца ад нуля да мінус 7 градусаў, удзень будзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня прагназуецца няўстойлівы характар надвор'я. Тады праз тэрыторыю Беларусі будуць рухацца атмасферныя франты атлантычнага цыклону, што перамяшчаецца да нас з боку Заходняй Еўропы. У панядзелак часам будзе ісці мокры снег, які ўдзень будзе пераходзіць у дождж. Месцамі чакаецца туман і галалёд. Уначы і раніцай на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 5 градусаў, удзень — ад нуля да плюс 6.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА**

**5 разоў на тыдзень!**

**Падпісацца на газету на І квартал можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП "Белпошта"; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.**

**Падпісацца на «Звязду» можна заўсёды!**

**Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.**

■ Парламенцкі дзённік

# КУДЫ ВЯДЗЕ «ЛЕСВІЦА ПОСПЕХУ»

## Школьнікі наведалі Палату прадстаўнікоў

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў сустрэліся з настаўнікамі і навучэнцамі школ і гімназій Слонімскага раёна — удзельнікамі адукацыйнай праграмы «Лесвіца поспеху». На сустрэчы абмяркоўвалася роля моладзі ў сённяшнім свеце, яе патэнцыял, а таксама дзяржаўная маладзёжная палітыка.**

— Год моладзі завяршаецца, але праца з моладдзю — не, — упэўнены **Аляксандр СЯГОДНІК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры, навуцы.** — Год моладзі паказаў, як яшчэ можна працаваць з маладымі людзьмі. Уся Палата прадстаўнікоў, не толькі камісія па адукацыі, культуры, навуцы, актыўна працуе з моладдзю. У нас практычна ў кожным рэгіёне ёсць маладзёжны парламент, і амаль усе яго ўдзельнікі пабывалі ў Палацы прадстаўнікоў. Я, напрыклад, арганізоўваў сустрэчу і для маладзёжнага парламента Гродзенскай вобласці, і для маладзёжнага парламента сваёй Ваўкавыскай акругі.

«Лесвіца поспеху» — праграма, якая сумесна рэалізуецца ў рамках праекта «Школьная акадэмія кіравання» Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце і Слонімскім райвыканкамам.

**Парламентарый Ала СОПІКАВА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры, навуцы,** падзяліла, што мэта праграмы — расказаць маладым людзям пра тое, якімі кампетэнцыямі павінны валодаць будучыя кіраўнікі.

— Нам важна разумець, якая сённяшняя моладзь, якім патэнцыялам яна валодае, наколькі яна патрыятычная, — адзначае Ала Сопікава. — Мэта гэтай сустрэчы — даведацца, як гэта — быць маладым у XXI стагоддзі.

У рамках праграмы «Лесвіца поспеху» школьнікі і гімназісты Слоніма наведалі шэраг семінараў і майстар-класаў у Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце, а таксама пабывалі ў Палацы прадстаўнікоў.

**Марат ЖЫЛІНСКІ, рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь,** паведаміў, што такога тыпу мерапрыемства праходзіць упершыню.

— Гэта вынік падпісання дагавора паміж Акадэміяй кіравання і Слонімскім раённым выканаўчым камітэтам. Мерапрыемства можна разглядаць як выкананне даручэння кіраўніка дзяржавы, які заклікае ўсе адукацыйныя ўстановы наблізіцца да рэальнасці і накіраваць патэнцыял моладзі ў тое русла, якое яна выбера.

**Настасся КЛІМОВІЧ, навучэнка гімназіі №1 горада Слоніма,** адна з удзельніц адукацыйнай праграмы «Лесвіца поспеху»:

— Я мару адкрыць сваё невялікае прадпрыемства, — прызналася дзяўчына. — Лічу, што акадэмія мне ў гэтым дапаможа: яна дае добрыя веды і перспектывы.

— У нашым раёне моладзь жыве актыўна, — адзначае **Тэрэса ЮШКЕВІЧ, начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Слонімскага райвыканкама.** — Прыклад гэтаму — рэалізацыя праекта для старшакласнікаў «Школьная акадэмія кіравання», у якім прымае ўдзел 25 школьнікаў і гімназістаў. Самае галоўнае ў гэтым праекце тое, што нашы дзеці — выпускнікі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі — маюць магчымасць зараз убачыць, які ўзровень ведаў павінен быць у сучаснага выпускніка, каб паступіць у ВНУ.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Будаўніцтва жылля

# ГОД — ЗА 10 МЕСЯЦАЎ

## Сёлета будаўнічыя арганізацыі краіны перавыканалі гадавы план па ўводзе жылля

**За 10 месяцаў года на будаўніцтва жылля было выдаткавана 33 трлн інвестыцый у асноўны капітал, што складае 20,2% да агульнага аб'ёму інвестыцый і 88,6% да ўзроўню адпаведнага перыяду летась. Аб гэтым рэдакцыі паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.**

Спецыялісты падлічылі, што арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці пабудавана 46,8 тысячы новых кватэр. Уведзена ў эксплуатацыю 4 млн 302,6 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля, што складае 107,6% да прадугледжанага задання на год і 100,7% да ўзроўню аналагічнага леташняга перыяду.

Для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 1 млн 736 тысяч «квадратаў» агульнай плошчы, або 40,3% ад агульнага аб'ёму ўвездзенага жылля. У параўнанні са студзенем–кастрычнікам 2014 года ўвод у эксплуатацыю жылля для гэтай катэгорыі грамадзян паменшыўся на 488,7 тысячы квадратных метраў. Акрамя таго, сёлета для чаргавікоў пабудавана з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі 1 млн 396,1 тысячы квадратных метраў, у шматкватэрных жылых дамах у гарадах — 1 млн 42,6 тысячы квадратных метраў.

У сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 1 млн 236,9 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля, або 28,7% ад агульнага ўводу па краіне.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

**Дэпутаты і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку аддзела па забеспячэнні дзейнасці Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы Бронніканў Андрэю Сяргеевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

■ На слыху

# Страхавы стаж, неабходны для пенсіі, будуць павялічваць

**Пра магчымасць такой рэформы заявіў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ. «Захады, якія прымаюцца ў рэспубліцы ў апошнія гады, накіраваны на фарміраванне разумення, што пенсія павінна зарабляцца, на стымуляванне работнікаў да легалізацыі працоўнай дзейнасці і сваіх прыбыткаў, — каментуе намеснік міністра. — На жаль, нашы грамадзяне, калі згаджаюцца на працу без афармлення адносін і атрыманне заробкаў у «канвертах», не задумваюцца пра тое, што іх чакае ў будучыні».**

### Правілы для тых, хто працуе дома...

Адзіная крыніца фінансавання пенсій — узносы наймальнікаў і работнікаў на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне. На пенсіі ідзе каля 77 працэнтаў сродкаў пазабюджэтнага фонду сацабароны насельніцтва. За дзевяць месяцаў гэтага года на такія мэты было выдаткавана больш за 61 мільярд рублёў. Таму заканадаўства прадугледжвае, што ўмовы налічэння выплат са сродкаў сацыяльнага страхавання могуць уключаць патрабаванні аб мінімальным перыядзе платы ўзносаў да прызначэння выплат.

Для тых, хто ўладкаваны афіцыйна, павышэнне абавязковага стажу, на думку міністэрства, істотна нічога не зменіць. Неабходны цяпер 15 гадоў стажу меншыя за перыяд працоўнай актыўнасці работніка. А сярэдні тэрмін атрымання пенсіі складае 21 год. У страхавы стаж залічваюцца перыяды працы ў Беларусі, а таксама на тэрыторыі СССР да 1 студзеня 1992 года.

Людзям, якія ўжо на пенсіі ці збіраюцца на яе ў найбліжэйшы час, турбавацца не варта. Пры разглядзе пытання аб праве на выплаты па ўзросце прымяняецца заканадаўства, што дзейнічае на дату прызначэння пенсіі.

Да асобных катэгорый грамадзян агульныя патрабаванні да стажу не прымяняюцца. Напрыклад, у дачыненні маці, што выхоўвалі дзіця-інваліда. Паводле заканадаўства, такія жанчыны, калі яны даглядалі малога з асаблівасцямі ў развіцці не менш за восем гадоў у перыяд да яго паўналецця, маюць права выйсці на пенсію па ўзросце ў 50 гадоў. Для гэтага стаж павінен складаць мінімум 20 гадоў, з іх не менш за пяць — з выплатай абавязковых страхавых узносаў у пазабюджэтны фонд сацабароны насельніцтва. У 20-гадовы стаж уключаюцца перыяды працы, навучання ва ўстановах адукацыі дзённай формы, знаходжання ў водпуску па доглядзе малых да трох гадоў, доглядзе дзіцяці-інваліда ці інваліда першай групы.

Валерый Кавалькоў нагадаў, што пенсія па ўзросце прызначаецца з дня звяртання па яе. Для вылічэння выплат бярэцца заробак работніка па звестках фонду сацабароны насельніцтва (сёлета заработная плата вылічаецца за апошнія 21 год запар стажу, у 2016-м — за 22 гады, у 2017-м — за 23). Тыя, хто мае права на розныя дзяржаўныя пенсіі (напрыклад, ваенную і па ўзросце), згодна з артыкулам 6 Закона «Аб пенсійным забеспячэнні», можа атрымліваць толькі адну з іх на свой выбар.

### ... і за мяжой

Ці можа беларус, які працуе за мяжой, разлічваць на беларускую пенсію? Аказваецца, можа. Пры ўмове, што ён самастойна плаціць страхавыя ўзносы ў бюджэт фонду і такім чынам фарміруе свае пенсійныя правы. Такая магчымасць прадастаўлена са жніўня 2006 года. Сёння сродкі на страхаванне ў Беларусі пералічваюць 714 суайчыннікаў, якія ўладкаваліся ў іншых краінах. Памер абавязковых узносаў — 29 працэнтаў ад прыбытку. Але калі ўзносы выплачваюцца з даходу, ніжэйшага за мінімальны заробак, стаж будзе скарэктаваны ў бок змяншэння.

Увогуле, права на пенсію ў Беларусі маюць грамадзяне, якія пастаянна пражываюць на яе тэрыторыі. Падстаў, каб тыя, хто выехаў на ПМЖ у іншыя краіны, атрымлівалі ў перыяд часовага знаходжання ў рэспубліцы выплаты па ўзросце, няма.

Міжнародныя дагаворы ў галіне пенсійнага забеспячэння наша краіна мае амаль з усімі дзяржавамі, што раней уваходзілі ў СССР (за выключэннем Грузіі і Эстоніі). Кожны квартал за мяжу (у асноўным у Расію, Латвію і Літву) пераводзяцца выплаты амаль 5,3 тысячам атрымальнікаў на суму 11,5 мільярда рублёў. На месцы пенсія выдаецца ў нацыянальнай валюце краіны пражывання грамадзяніна.

Сёння вядзецца праца па заключэнні пенсійнага дагавора ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза. Разглядаюцца прапановы па падпісанні падобных дагавораў з Чэхіяй, Польшчай і Эстоніяй.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

# Барацьба за прэстыж дыплома...

## Дык быць у Белдзяржуніверсітэце платным пераздачам ці не быць?

**Здавалася б, кропка ў гэтым пытанні была пастаўлена яшчэ два тыдні таму, калі рашэннем рэктара платныя пераздачы ў БДУ былі ўзаконены. Аднак пэўная частка студэнцкай супольнасці па-ранейшаму не пагаджаецца з кіраўніцтвам універсітэта і, каб выказаць сваю пазіцыю, студэнтаў заклікаюць выйсці на марш «Каханне і салідарнасць».**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Таму днямі на сайце ўніверсітэта быў размешчаны афіцыйны зварот **рэктара БДУ, акадэміка Сяргея АБЛАМЕЙКІ,** да студэнтаў і выкладчыкаў.

«БДУ абураны спробамі перавесці абмеркаванне пытання аб увядзенні платы за пераздачу залікаў і экзаменаў з выключна адукацыйнай і прававой у палітычную плоскасць, — падкрэсліваецца ў афіцыйным звароце. — Нас хвалююць якасць адукацыі і прэстыж дыплома БДУ. Клапоцячыся пра гэта, універсітэт увёў плату за пераздачу залікаў і экзаменаў, што з'яўляецца адным з інструментаў уплыву на вучобу студэнтаў. Акрамя гэтага, прымяняецца і шэраг іншых мер па паляпшэнні якасці адукацыйнага працэсу. Звяртаем увагу, што **БДУ не ўводзіць аплату за адпрацоўку прапушчаных заняткаў, лабараторных работ, як гэта падаецца ў некаторых інфармацыйных паведамленнях».**

Сяргей Абламейка запэўнівае, што ва ўніверсітэце паважліва ставяцца да меркавання сваіх студэнтаў і імкнуцца ствараць усе ўмовы для актыўнага дыялогу, прыцягваючы да вырашэння важных пытанняў універсітэцкага жыцця развіццю сістэму органаў студэнцкага самакіравання. Да таго ж любы студэнт і супрацоўнік могуць звярнуцца да рэктара БДУ ва ўстаноўленым парадку, у тым ліку і з дапамогай электроннага звароту, запісацца да яго на прыём. Рэктарат БДУ атрымаў калектыўны зварот студэнтаў па пытанні ўвядзення платы за пераздачы і адказаў на гэты зварот. Але пасля падачы звароту ніхто са студэнтаў па гэтым пытанні на прыём да рэктара або прарэктара не прыходзіў...

«Інфармацыя аб тым, што на студэнтаў БДУ аказваюцца ціск, якая распаўсюджваецца некаторымі інфармацыйнымі рэсурсамі, не адпавядае рэчаіснасці. Канкрэтныя факты аб кожным падобным выпадку стануць прадметам разгляду на ўзроўні кіраўніцтва ўніверсітэта», — паабяцаў Сяргей Абламейка.

Рэктар лічыць недапушчальнымі спробы ўцягнуць студэнтаў БДУ і іншых універсітэтаў краіны ў працэсы, закліканыя расколваць акадэмічную супольнасць і скампраметаваць сістэму вышэйшай адукацыі краіны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Добрая навіна

# «ХУТКІЯ» КАНТРАЛЮЮЦЦА СПАДАРОЖНІКАМІ

## На тры машыны «хуткай дапамогі» стала больш у Полацкім раёне

— Дзве «хуткія» на базе «газелі» перададзены на Ветрынскі пост і падстанцыю хуткай і неадкладнай медыцынскай дапамогі. «Мерседэс-спрынтар» — на станцыю бальніцы. Першыя дзве набыты за кошт мясцовага бюджэту: 800 мільёнаў рублёў (з прыцягненнем уласных сродкаў медустановы — 77 мільёнаў). Новыя «газелі» — поўнапрывадныя, што забяспечвае ім павышаную праходнасць. Гэта дазволіць эксплуатацыю ў сельскай мясцовасці на бездарожжы і пры неспрыяльных умовах надвор'я. А «мерседэс» падораны ў рамках гуманітарнай дапамогі нямецкага горада-пабрацціма Фрыдрыхсхафэн. Да гэтага жыхароў Полаччыны абслугоўвалі 11 аўтамабіляў «хуткай дапамогі». Сярод іх і рэанімабіль «Рэно-Майстар», — расказаў **Яўген ПАДАЛЯКА, загадчык станцыі хуткай і неадкладнай медыцынскай дапамогі Полацкай цэнтральнай гарадской бальніцы.**

Аўтатранспарт службы «хуткай» рэгіёна абсталяваны датчыкамі сістэмы спадарожнікавага назірання. Гэта зроблена для вызначэння месцазнаходжання брыгады. Аператыўны аддзел і выязныя брыгады аснашчаны найноўшымі сродкамі сувязі.

— Згодна з мінімальнымі сацыяльнымі стандартамі па медыцынскім абслугоўванні насельніцтва, забяспечанасць брыгадамі хуткай медыцынскай дапамогі складае 111%. Адпаведны нарматыў забяспечанасці: брыгада на 12 тысяч жыхароў, — падкрэсліла **Валянціна УЛАСЕНКА, прэс-сакратар Полацкага райвыканкама.**

За 10 месяцаў гэтага года «хуткія» выязджалі на дапамогу больш як 27 тысяч разоў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

■ Віншуем!

# ГЛЫБАКАВОДНАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ РАКА

## 70 гадоў — з «Нёманам»

**Гэта свята для тых, хто любіць чытаць. Гэта свята падаравалі Беларусі, калі яна перажывала цяжкія часы аднаўлення пасля вайны. Людзі, якія прайшлі праз пакуты на шляху да міру, хацелі прыкмет мірнага жыцця. Калі ласка: мастацкая творчасць, літаратура. Тое, дзе душа адпачывае. І для гэтага ўжо быў час.**



Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілія АНАНІЧ віншуе галоўнага рэдактара часопіса «Нёман» Аляксея ЧАРОТУ.

70 гадоў з выхаду першага нумара часопіса былі рознымі. Таму што спачатку ён — альманах, за які адказвала рэдкалегія, потым часопіс падпісваюць рэдактары — і гэта асобы, сярод якіх, напрыклад, былі народны пісьменнік Беларусі Іван Шамякін, Пімен Панчанка, Андрэй Макаёнак... Усе, каму выпала працаваць у гэтым часопісе за савецкім часам, ствaралі яму славу і прэстыж. Наогул, тады «тоўстыя» часопісы былі ў пашане. Гэта быў у поўным сэнсе тытул. «Тоўстымі» іх называлі не толькі з прычыны колькасці старонак. «Тоўсты» — значыць, важкі. Паважаны.

За што паважалі «Нёман», беларускі літаратурны часопіс на рускай мове? За тое, што знаёміў з найлепшымі айчыннымі творамі. За тое, што ўмеў рабіць вядомымі іх аўтараў на абшарах Савецкага Саюза. За тое, што друкаваў у Беларусі выдатныя творы пісьменнікаў іншых рэспублік і нават усяго свету.

Адзін з былых галоўных рэдактараў «Нёмана» Алесь Жук успомніў тыя часы, калі часопіс быў папулярны на тэрыторыі ад Брэста да Курылаў і меў агульны тыраж 180 тысяч экзэмпляраў, а колькасць яго падпісчыкаў па Беларусі вагалася ў межах 13-18 тысяч. «Думалі, як прыцягнуць чытача, і друкавалі тых, каго хацелі чытаць, напрыклад Маркеса. Але і пасля тыраж не знізіўся — удавалася трымаць увагу, у тым ліку за кошт твораў, якія нараджаліся ў Беларусі». Існаванне выдання і прэстыж залежаць ад таго, што ёсць у рэдакцыйным партфелі. «Нёман» арыентаваўся на высокамастацкія творы.

Хто і за што паважае гэты часопіс ў нашы дні? У прывітанні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў адрас рэдакцыйнага калектыву адзначана, што часопіс «працягвае традыцыі знакавага літаратурнага выдання нашай краіны». Міністр інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч гэта падкрэсліла, калі звярталася да тых, хто робіць часопіс у нашы дні, трымаючы ўзровень, закладзены папярэднікамі. Былі вітанні ад намесніка прэм'ер-міністра Наталлі Качанавай, міністра культуры Барыса Святлова.

Часопіс, які адчувае час, працуе на чытачка разам з іншымі перыядычнымі выданнямі Беларусі, атрымаў віншаванні ад калег. Добрым партнёрам, напрыклад, з'яўляецца газета «СБ. Беларусь сегодня». Намеснік галоўнага рэдактара газеты Галіна Тарапецкая павіншавала калектыў «Нёмана»: адну справу для Беларусі робіць розныя выданні, калі праз словы даносяць сэнс. Сакрэт аўтарытэту «тоўстых» часопісаў — у магутным літаратурным падмурку.

Ад Саюза пісьменнікаў Беларусі віншаванні перадаў першы сакратар Саюза пісьменнікаў Генадзь Пашкоў. Ён трымаў юбілейны нумар з асаблівым пачуццём: «Я ўспомніў 70-я гады, калі ў першы раз у «Нёмане» была надрукавана падборка вершаў з прадмовай Анатоля Вялюгіна. Я помню, як Браніслаў Спрынчан вельмі беражліва ставіўся да ўсіх пісьменнікаў, але асабліва да маладых як да будучыні літаратуры. Мне вельмі прыемна ў юбілейным нумары ўбачыць свае вершы».

Уладзіслаў Цыдзік, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па аграрнай палітыцы, успомніў, як у гады свайго юнацтва імкнуўся выпісваць часопіс, «які адлюстроўвае нашу духоўнасць».

Паважаюць «Нёман» і па-за межамі Беларусі. За што, патлумачыў Алесь Бадак, галоўны рэдактар часопіса ў 2009–2014 гадах: «Нёман» выстаяў у складаныя часы, калі адзначалася падзенне цікавасці да друкаваных выданняў. Але ён яшчэ і аб'яднаў пісьменнікаў з краін СНД. Яны выказваюць светлую зайздрасць да нашых літаратурных выданняў, таму што «Нёман» не проста выходзіць, ён мае тыраж, пра які ў многіх былых рэспубліках сёння толькі мараць». Акрамя таго, часопіс ажыццяўляе шэраг міжнародных творчых праектаў, што адзначана ў віншаванні Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Рыгора Рапоты. «Нёман» ведаюць па-за межамі Беларусі тых, хто цікавіцца мастацкай творчасцю ў нашай краіне.

Але «Нёман» — наш. І па ім можна зразумець асноўныя тэндэнцыі, якія сёння ёсць у грамадскім жыцці Беларусі, на якія рэагуюць творцы, а потым іх прадстаўляе рэдакцыя (невялікая, над часопісам працуюць 6 чалавек) на чале з рэдактарам Аляксеем Чаротам. Дырэктар — галоўны рэдактар «Выдавецкага дома «Звязда» (у які выдавецкага дома «Звязда» (у якім выдаецца і «Нёман») Алесь Карлюкевіч патлумачыў задачы на сёння: «Мы займаемся прадстаўленнем беларускай літаратуры на рускай мове і рускай літаратуры ў Беларусі, творчасці тых пісьменнікаў, якія ў цесным кантакце з Беларуссю. Часопіс актыўна прадстаўляе гісторыю нашай краіны, цікавыя публіцыстычныя матэрыялы, шмат публікацый літаратуразнаўчай, дзякуючы ў тым ліку партнёрству з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі. «Нёман» накіраваны на пошук новых ідэй і аўтараў, здольных у складаных умовах — не зусім спрыяльных у сусветнай прасторы — займацца мастацкай творчасцю. Калектыў прыцягвае гэтых людзей, каб весці размову з чытачом».

**Марыя АСІПЕНКА**

■



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Наталля Казапалянская і Наталля Саветная «адкрываюць» гісторыю «Нёмана» розных гадоў.

■ Святло ў акне

# У СЯМ'І ЛЕПШ

**Да канца гэтага года ў Магілёўскай вобласці яшчэ некалькі дзяцей знойдуць бацькоў.**

Дзіцячыя дамы сямейнага тыпу плануецца адкрыць ў Клічаве і Крычаве. Наогул у вобласці робіцца шмат для таго, каб дзіця выхоўвалася ў сям'і. За апошнія 6 гадоў рэарганізавана або прыпыніла сваё існаванне 8 інтэрнатаў. Створана 49 дзіцячых дамоў сямейнага тыпу і больш за 1500 замяшчальных сем'яў, дзе выхоўваюцца амаль 85% дзяцей.

Інфармацыйная кампанія «У сям'і лепш», якая стартавала на Магілёўшчыне і працягнецца да чэрвеня наступнага года, якраз і накіравана на тое, каб паднясць прэстыж такіх сем'яў.

Спецыялісты звяртаюць увагу і на тое, што існуе неабходнасць суправаджэння мам і татаў, якія выхоўваюць прыёмнае дзіця. Адным з такіх праектаў стала «Школа бацькоў» — у яе рамках «SOS — Дзіцячая вёска» аказвае псіхалагічную, педагагічную і сацыяльна-прававу дапамогу і падтрымку. Доўгатэрміновымі (да 6 месяцаў) удзельнікамі праекта сталі звыш 400 дзяцей і 150 бацькоў. Штомесяц каля 20 бацькоў і 10 дзяцей атрымліваюць кароткатэрміновую дапамогу.

— Як высвятляецца, нават маральна падрыхтаваныя сем'і не заўсёды правільна ацэньваюць свае сілы па выхаванні чужога дзіцяці, — лічыць **каардынатар праекта, кіраўнік аддзела падтрымкі сям'і і дзіця «SOS — Дзіцячая вёска» Таццяна ШМАН**. — Ёсць пытанні, па якіх не хапае ведаў і спецыялістам дзяржустаноў. У нашай арганізацыі назапашаны вялікі вопыт працы, і мы гатовы дапамагчы не толькі тым, хто ўзяў на выхаванне або ўсынавіў дзіця, але і айчымам, мачыхам, усім астатнім. Цесна працуем з прадстаўнікамі раёнаў, арганізоўваем семінары, трэнінгі. Галоўная мэта — навучыць спецыялістаў, якія працуюць тэрытарыяльна. Каб потым яны гэты вопыт распаўсюджвалі на іншых.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*zigulya@zviazda.by*

# АХОВА ЗДАРОЎЯ Ў ЭЛЕКТРОННЫМ ВАРЫЯНЦЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Другі момант — аб'яднанне ўсіх дзяржаўных арганізацый аховы здароўя ў адзіную сетку, пры гэтым магчыма і стварэнне поўных карпаратыўных сетак. Такім чынам, звесткі, пазначаныя ў той ж электроннай картцы ў паліклінічнай установе, будуць даступнымі і ўрачу бальніцы. Трэці напрамак — больш актыўнае развіццё тэлемедыцыны. Найперш па прынцыпе «ўрач-урач» пры неабходнасці правядзення дыстанцыйнай кансультацыі ў складаных выпадках, а таксама для навучання медыкаў. Раённая ўстанова спачатку будзе звяртацца па кансультацыю ў абласную, пасля, пры неабходнасці, у рэспубліканскую. Адзіная рэспубліканская сістэма тэлемедыцынскага кансультавання будзе ахопліваць усе рэспубліканскія цэнтры, асноўныя абласныя арганізацыі і да паловы раённых.

Як адзначае **галоўны ўрач 29-й гарадской паліклінікі г. Мінска Раіса ЗВАНЕЦ**, ва ўстанове аўтаматызаваны ўжо ўсе працоўныя месцы — і ўрачоў, і медсясцёр. Дзякуючы распрацаваным шаблонам дзеянняў, ва ўрача застаецца больш часу для пацыента. «Мы сёння ў электронным выглядзе маем максімальна поўныя звесткі аб пацыенце, уключаючы вынікі аналізаў, флюараграфіі, электракардыяграфіі, — кажа **галоўны ўрач 34-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Наталля ДЗЯРГАЧ**. — Увядзенне электронных рэцэптаў дазваляе кантраляваць набыццё лекаў ільготнай катэгорыяй грамадзян. Маем і магчымасць перадачы даных у іншыя ўстановы аховы здароўя. Ад папяровых носьбітаў мы таксама не адмаўляемся — так робіцца і ў іншых краінах. Але папяровы носьбіт можа быць менш інфарматыўным».

У сталіцы чатырма паліклінікамі (а ў хуткім часе да іх далучыцца яшчэ восем) ужо выпісана каля 6 тысяч электронных рэцэптаў. Праўда, атаваранай аказалася досыць нязначная іх частка, што можа быць звязана са звычкай карыстацца папяровым носьбітам інфармацыі (іх выдаюць разам з электроннымі), або пацыенты скарысталіся паслугамі камерцыйных аптэк, не ўключаных пакуль у сістэму электронных рэцэптаў.

Пацыенты 19-й, 29-й, 34-й і 39-й гарадскіх паліклінік маюць магчымасць прад'яўляць у дзяржаўных аптэках пластыкавую картку (іх бясплатна выдаюць у паліклініцы ў рамках пілотнага праекта). Доступ да электроннага рэцэпта забяспечвае штрых-код, які правізару дастаткова проста адсканіраваць. Цягам наступнага года на электронныя рэцэпты павінны перайсці ўсе ўстановы аховы здароўя.

Што да камерцыйных медыцынскіх цэнтраў, то іх уключэнне ў адзіную інфармацыйную сістэму пакуль не разглядалася. Аднак практычна гэта цалкам магчыма. Разам з тым, яшчэ вырашаецца шэраг пытанняў, у тым ліку інфармацыйнай бяспекі, увядзення практыкі электроннага подпісу.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

*protas@zviazda.by*

БПС-СБЕРБАНК

С 27.11.2015 ОАО «БПС-Сбербанк» снижает размер процентов по действующим договорам в долларах США и евро срочного банковского депозита «Доверяй +» с установлением следующего размера процентов:

| Дата заключения договора | Размер процентов (годовых) |
|---|---|
| с 14.10.2014 по 08.07.2015 | от 100 до 300 000 – **4** |

Установленный размер процентов будет применен с 27.12.2015.

Дополнительную информацию можно получить в любом подразделении ОАО «БПС-Сбербанк», на сайте банка **www.bps-sberbank.by** или по единому короткому номеру **148**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк».

ИЗВЕЩЕНИЕ

**Государственное производственное объединение**

**«Минскстрой»**

УНП 100071325

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ДОПОЛНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ ОБЪЕКТА «Жилой дом № 1 по генплану в квартале улиц Горецкого, Шаранговича, лесопарк «Медвежино» в г. Минске, опубликованную в газете «Звязда» 06 февраля 2015 года:**

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади квартир №№ 10, 14, 18, 35, 36, 38, 39, 42, 44, 51, 54, 58, 60, 81, 86, 93, 97, 101, 102, 113, 117, 121, 122 с учетом выполнения внутренних отделочных работ составляет: 1-комнатные квартиры – 1050 долларов США, 2-комнатные квартиры – 1000 долларов США с предоставлением рассрочки платежей до конца января 2016 года.

Стоимость 1 кв. метра общей площади фиксируется в долларах США и остается неизменной в долларах США до окончания действия договора создания объекта долевого строительства. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату оплаты.

При 100% оплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение 5 (пяти) банковских дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную 100 долларам США и составит, соответственно, 950 и 900 долларов США.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

*Генеральный директор Н.В.Милошевский*

■ Цікава

# ПАЛЯВАННЕ НА ПАКУПНІКА

## 10 актуальных трэндаў выкарыстання тэхналогій у продажы найбліжэйшай будучыні



**Маркетолагі ўсё бліжэй прыходзяць у жыццё спажыўцоў — нават за межамі крам. У гэтым ім дапамагаюць інфармацыйныя тэхналогіі. Яны ўмела вывучаюць густы патэнцыйных пакупнікоў, а потым навязваюць рэкламу на ўсіх наяўных прыладах — ад смартфона да камп'ютара. У наступным дзесяцігоддзі, дзякуючы новым прыборам, якія ўваходзяць у наша жыццё ўсё шчыльней, рынак тавараў і паслуг чакаюць глабальныя змены. Да гэтага сёння прыстасоўваюцца і маркетолагі. Для іх адкрываецца больш шырокія магчымасці па стымуляванні пакупніцкай здольнасці, знаходзячы чалавека ў любы час у любым месцы там, дзе ёсць доступ да інтэрнэту.**

### ПАКУПНІКІ ПАКАЛЕННЯ NEXT

**Дырэктар рэкламнай кампаніі па развіцці і новых прадуктах у інтэрнэце Іван ФЁДАРАЎ** займаецца распрацоўкай платформаў для кіравання рэкламай. Гэта якраз тая вобласць, у якой цяпер назіраецца самы вялікі разрыў паміж развіццём тэхналогій кіравання рэкламай і тым, як яе асвойвае бізнес. На думку спецыяліста, многія да гэтага часу спрабуюць выкарыстоўваць тыя ж падыходы ў маркетынгу, якія напрацавалі за апошнія 5-10 гадоў. А гэта малаэфектыўна. Летась эксперты зрабілі прагноз, паводле якога, 20% кампаній, якія з'яўляюцца лідарамі на сваіх рынках, да 2017-га страцяць свае пазіцыі. І прайграюць яны ў асноўным маладым кампаніям, якія ўзніклі зусім нядаўна, але арыентаваны на сучаснага пакупніка. Прагноз ужо паступова збываецца, калі паглядзець на такія сферы, як фінансаванне, турызм і транспарт. Чаму ж адбываюцца такія змены? Прычына ў тым, што афарміўся новы тып пакупніка. Гэта ўзроставая група ад 18 да 35 гадоў, на якую сёння імкнецца арыентавацца большасць рэкламадаўцаў. Яны вельмі адрозніваюцца ад папярэдніх пакаленняў: хутка асвойваюць новыя тэхналогіі, вельмі сацыяльныя, актыўна дзеляцца вопытам і лёгка яго пераймаюць. Яны любяць удзельнічаць у стварэнні новых паслуг, кантэнту, прадуктаў. Калі гэтыя якія характарыстыкі не ўлічваць, то бізнесу будзе цяжка ў будучыні прасоўваць свае прадукты.

### РЭКЛАМА Ў КОЖНЫМ ПРЫБОРЫ

У свеце ўжо ёсць тэхналогіі і напрацоўкі, якія дазваляюць маркетолагам плённа ўзаемадзейнічаць з пакупнікамі і іх персанальнымі прыладамі. Вось 10 трэндаў, якія, на думку Івана Фёдарава, будуць стымуляваць паспяховыя продажы «пакаленню NEXT».

**1.** Omni-channel — ахоп усіх каналаў камунікацыі з кліентамі. Гэтая тэхналогія ўжо сёння дазваляе выкарыстоўваць вялікую колькасць новых каналаў продажаў, якіх раней не існавала. Сёння мы купляем прадукты і паслугі ў банкаматах, у інфармацыйных кіёсках, у мабільных гульнях. Пакаленне міленіума адаптуецца і прымае такія віды пакупак. Маркетолагі будуць выкарыстоўваць больш магчымасцяў для продажаў.

**2.** У пакупнікоў вялікая колькасць гаджэтаў. Купля ў 40% выпадкаў адбываецца з некалькіх з іх. Спажывец шукае тавар праз ноўтбук, потым афармляе куплю праз смартфон ці планшэт. Прадаўцы не бачаць большую частку пакупніцкай гісторыі, а значыць, не могуць прапаноўваць кліенту ўсё, што лічаць патрэбным. Для гэтага будуць выкарыстоўвацца спецыяльныя камп'ютарныя каталогі і іншыя тэхналогіі, якія будуць узаемадзейнічаць са смартфонам пакупніка і такім чынам адпраўляць яму мэтавую рэкламу і выгадныя прапановы.

**3.** Вытворцы будуць дазваляць удзельнічаць у стварэнні прадукту. Усё больш пакупнікоў жадаюць удзельнічаць у стварэнні сваёй персанальнай рэчы. Сёння ўжо нямала сусветных брэндаў, якія за кошт гэтага прыцягваюць усё больш спажыўцоў. Шэраг кампаній, якія займаюцца стварэннем адзення і абутку, даюць магчымасць карыстальнікам у рэжыме анлайн змяняць колер дэталяў, форму, узоры. Потым на гэты вопыт вытворцы абапіраюцца пры стварэнні новага прадукту.

**4.** Маркетолагі больш дакладна пралічаць тое, як пакупнікі будуць прыходзіць і ўзаемадзейнічаць з прадуктам. За кошт таго, што ёсць новыя прыборы і каналы продажаў, якія людзі ўсё яшчэ асвойваюць, прадавец можа навязваць тое, як пакупніку прыходзіць па прадукт, а таксама як яго выкарыстоўваць.

**5.** Шмат інфармацыі. Сёння існуюць «чорныя скрыні» з велізарнай колькасцю звестак ад пакупнікоў, якія наведваюць сайты вытворцаў. З іх можна здабываць інфармацыю. Гэта дазволіць кампаніям знаходзіць новыя магчымасці для таго, каб спрасціць вядзенне бізнесу, параіць спажыўцу менавіта той тавар, які, згодна з аналізам яго пакупніцкай гісторыі, хутчэй за ўсё спатрэбіцца яму ў будучыні.

**6.** Мабільнасць. 2 мільярды чалавек ва ўсім свеце карыстаюцца смартфонамі, а да 2020 года імі будуць карыстацца 80% насельніцтва. Камунікацыя стане яшчэ больш мабільнай. Гэта дазволіць вытворцам і прадаўцам наблізіцца да пакупніка.

**7.** Вопыт карыстальнікаў. Сёння прадаюцца не проста тавары і паслугі, але і пакупніцкі вопыт. Напрыклад, пакупнік можа прачытаць водгук у сацыяльнай сетцы аб прадукце і зрабіць высновы. Зрабіўшы пакупку, чалавек здольны распаўсюджваць інфармацыю сярод сваіх сяброў і знаёмых аб якасці абслугоўвання. Гэтым вопытам прадаўцы будуць маніпуляваць лепш. Яны будуць ведаць, хто, што, дзе і як піша пра прадукт. Акрамя таго, кампаніі могуць самі фарміраваць такі вопыт, загадзя праплочваючы пэўныя інфармацыйныя паведамленні на розных сацыяльных платформах.

**8.** Персаналізацыя прадукту. Напрыклад, сёння на бутэльках з газіроўкай ужо пішуць імёны пакупнікоў. Але на гэтым вытворцы не спыняцца. Тэндэнцыя будзе ўкараняцца ў большую колькасць тавараў.

**9.** Сістэмнасць. Рэклама будзе паўсюль і на ўсіх прыладах. Прадаўцы будуць адсочваць усе прылады карыстальніка і сістэмна накіроўваць на іх кантэкстную рэкламу. Для іх важна забяспечыць адзінае ўзаемадзеянне з мэтавай аўдыторыяй ва ўсіх пунктах кантакту.

**10.** Маркетынг аўтаматызуецца. У свеце становіцца ўсё больш кампаній, якія займаюцца прасоўваннем тавару, ствараючы вядомы брэнд з пэўным іміджам. Задачы, для якіх раней была патрэбна знешняя экспертыза і рэсурсы, цяпер вырашаюцца больш эфектыўна і проста з дапамогай тэхналогій, якія становяцца ўсё больш даступнымі.

Як відаць, эра рэкламы яшчэ толькі пачынаецца. Інфармацыйныя тэхналогіі мяняюць маркетынг і робяць яго больш эфектыўным, размываючы ўсё больш межаў паміж прадуктам і кліентам. Пытанне толькі ў тым, ці будзе гэта добра для пакупніка і ці зможа ён разабрацца ў хаосе тысяч прапаноў? У хуткім часе мы гэта ўбачым.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

■ Узровень

# СЕЛЯДЗЕЦ З ГАРБУЗОМ І КАЛЯНДРАЙ

**Кампанія «Санта Брэмар» атрымала права выкарыстання гандлёвага знака Norge — на падставе пагаднення аб супрацоўніцтве з Нарвежскім камітэтам па рыбе. Дакумент дазваляе выпускаць і рэалізоўваць прадукты з лагатыпам, які сведчыць аб высокай якасці харчовых тавараў з рыбы і морапрадуктаў. Першы брэнд, у якім увасоблены нарвежскія традыцыі і падыходы да якасці, — селядзец «Маціяс».**

Філе селядца ў вакуумнай упакоўцы «Санта Брэмар» пачала некалі выпускаць першай на постсавецкай прасторы, з цягам часу на ўласным шматгадовым вопыце пераканаўшыся ў высокім узроўні партнёрства нарвежскіх вытворцаў сыравіны. Нарвежскі камітэт па рыбе падтрымлівае высокі аўтарытэт рыбнай галіны. Перш чым стаць партнёрам камітэта, «Санта Брэмар» даказала, што вытрымлівае сусветныя стандарты перапрацоўкі. Галоўным патрабаваннем была наяўнасць надзейнай сістэмы кантролю якасці сыравіны.

— Да селядца ў нас асаблівае стаўленне — гэта быў першы прадукт кампаніі, — адзначае **дырэктар СП «Санта Брэмар» Сяргей НЯДБАЙЛАЎ**. — Больш за ўсё ў падыходах нарвежскіх калег нас прываблівала асаблівая ашчаднасць перапрацоўкі, захаванне пры гэтым карыснасці і смаку прадукту.

Завод перапрацоўвае сёння да 100 т селядцоў у суткі. Пасля прыёмкі замарожанае філе нарвежскага селядца распакоўваецца і адпраўляецца на стэлажах у спецыяльныя камеры размарожвання, якія змяшчаюць да 16 т кожная. За кошт пары і арашэння, пры нізкай тэмпературы рыба размарожваецца цягам дзесяці гадзін, пасля чаго камера аўтаматычна адключаецца. Потым размарожанае філе адпраўляецца на лінію мыйкі і сартавання. Далей — пасол у чанах. Філе заліваецца салёнай вадой, якая называецца «тузлук» (рэцэпт яго, вядома, не раскрываецца). **Вядучы інжынер-тэхнолаг Ірына ТАРАСЮК** запэўнівае пры гэтым, што ад узмацняльніка смаку, глутамату натрыю, на прадпрыемстве адмовіліся, колькасць солі адпавядае смакаваму «парогу», а кансерванты — бензанат натрыю і сарбат калію, неабходныя для прыгнятання мікрафлоры, выкарыстоўваюць па мінімуме. Пасля гэтага рыбу ў спакоі не пакідаюць — у ашчадным рэжыме яна пастаянна перамешваецца ў камерах выспявання. З сырога ў салёнае філе ператвараецца цягам трох сутак.

Пасля выспявання паўфабрыкат перапраўляецца на абясшкурванне, дзе таксама выкарыстоўваецца ручная праца. Пры гэтым важна не страціць «сярэбраны слой» каштоўнага рыбінага тлушчу. Кантроль якасці на гэтым этапе такі, што можна ўстанавіць нават, хто і што менавіта апрацоўваў. Тут жа рыбу ўзважваюць (і гэта таксама на электронным кантролі), пасля чаго работніцы раскладваюць філе ў тару, якая ўпакоўваецца і атрымлівае лагатып «Norge» (прадукцыя з гэтым значком ёсць у гандлёвай сетцы Беларусі з канца вясны гэтага года).

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

*Мінск — Брэст*






**Генеральны дырэктар Нарвежскага гастранамічнага інстытута, сярэбраны прызёр конкурсу «Скандынаўскі шэф-повар 2010» Томі Рычард РАНЦІ** правёў для журналістаў майстар-клас па гатаванні нескладаных і незвычайных страў з селядца «Маціяс». Незвычайнасць заключаецца ў спалучэнні салёнага смаку з кіслым, салодкім і г.д. Запячыце ў духоўцы гарбуз (25 хвілін пры тэмпературы 190 градусаў, да мяккага стану). Парэжце салёную рыбу на кубікі, памарынуйце ў соку лайма з соллю (5-7 хвілін). Парэжце перац чылі і цыбулю на тонкія скрылікі і патрымайце ў марынадзе з воцату, цукру, солі і вады. Прасмажце кукурузу для папкорну, пакуль яна не стане паветранай. Для падачы парэжце запечаны гарбуз на тонкія кавалкі і пакладзіце на талерку. Адразу зверху пакладзіце рыбу, пасля цыбулю, перац чылі, папкорн і парэзанае лісце каляндры. Фантастычны смак высока ацанілі ўсе госці — і нашы, і нарвежскія.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

■ Сядзі і глядзі

# ГУЛЬНЯ ЎЯЎЛЕННЯ ДЛЯ САПРАЎДНЫХ РАМАНТЫКАЎ

**Дваццаць гадоў таму свет убачыў фільм «Гульня ўяўлення» рэжысёра Міхаіла Пташука, зняты па аднайменнай п'есе Эміля Брагінскага. Фільм іранічны, і яго смела можна прапаноўваць для прагляду як сямейным парам, так і тым, хто толькі ладзіць свае стасункі з другой «палавінкай». Гэта свайго роду добрая ілюстрацыя думкі (яна гучыць з вуснаў адной з гераінь карціны) пра тое, што адзінота застаўляе рабіць людзей вар'яцкія ўчынкі.**

Камедыя распавядае гісторыю з жыцця сямейнай пары Антошыных. Той выпадак, калі муж ездзіць па камандзіроўках, жонка шукае суцяшэння з іншым мужчынам, а дачка расце і выхоўваецца сама па сабе. Па сюжэце Маргарыта (гераіня Любові Палішчук) сыходзіць ад мужа і замест сябе прыводзіць у дом сваю сяброўку Ларысу (Ірына Селязнёва). Муж (Ігар Касталеўскі) шакіраваны ўчынкам жанчын, і спачатку здаецца нават немагчыма ўявіць развіццё падзей, аднак з гэтага ўсё толькі пачынаецца... І падчас прагляду карціны мы атрымліваем наглядную інструкцыю з жыцця, як выстройваць адносіны з іншымі людзьмі. Дарэчы, сярод акцёрскага складу тут можна сустрэць актрысу Юлію Высоцкую (гэта была яе другая спроба заявіць пра сябе ў кіно, але ўдалай яе не палічылі), у эпізадычнай ролі бачым легендарную Стэфанію Станюту (якой на час здымкаў было 90 гадоў), Аляксандр Філіпенка іграе ролю таго самага Лампасава (вобраз прымушае задумацца, чаму да такога мужчыны ідуць ад прыгожага і паспяхова мужа).

Фільм неадназначна прыняла крытыка і глядацкая аўдыторыя. Пра яго пісалі: «Застаецца загадкай, навошта Эміль Брагінскі прадаставіў магчымасць экранізаваць сваю п'есу «Гульня ўяўлення» менавіта Міхаілу Пташуку, рэжысёру з зусім не камедыйным творчым складам...». Далей ён выказвае думку, што і таленавітыя акцёры, як Ігар Касталеўскі і Любоў Палішчук, якія «неадноййчы вызначаліся ў камедыях і меладрамах, тут іграюць у нехарактэрнай ім натужлівай манеры «тэатральшчыны». Аднак кожны мастацкі твор заўсёды выклікае розныя рэакцыі. І некаторыя з гледачоў шчыра здзіўляюцца, чаму такі фільм застаўся амаль што невядомым, калі ў ім ёсць спалучэнне драмы і камедыі. Таму, думаю, варта паспрабаваць усё ж паглядзець яго і як мінімум зразумець, што ў вас ёсць уласная пазіцыя адносна гэтай кінакарціны.


Юлія Высоцкая толькі рабіла крокі ў вялікае кіно.

«Цудоўны, лёгкі фільм. Ён пазітыўны, добры і прасякнуты рамантыкай. Лёгкая лірычная камедыя ў духу французскага кіно. А песня Максіма Леанідава «Праплываючы над горадам» — проста шэдэўр». Такі водгук сустрэла ў інтэрнэце ад кіяўлянкі Аксаны. Аднак, калі пачала запытваць пра кінастужку ў сваіх знаёмых, то аказалася, што карціна малавядомая нават прыхільнікам рэтра. Разам з тым на тэлеэкране сустрэць «Гульню ўяўлення» сёння можна даволі часта.

Дарэчы, саўндтрэк да фільма напісаны Максімам Леанідавым (вядомым па групе «Сакрэт»). Не выключана, што ён быў прысвечаны якраз выканаўцы галоўнай жаночай ролі Ірыне Селязнёвай. Актрыса была яго першай жонкай. Яны вучыліся на адным курсе тэатральнага інстытута. І, як адзначала потым Ірына ў адным з інтэрв'ю, маладыя людзі доўга не звярталі адно на аднаго ўвагі. У кожнага была «палавінка». Аднак з часам у іх здарыўся раман. «Пасля сесіі я з'ехала ў Кіеў залечваць душэўныя раны... І, каб змяніць сваё жыццё, вырашыла абрэзаць валасы. І, о цуд! Тым жа летам здарыўся наш раман з Максімам. Пазней я запытвала ў яго: чаму ён у мяне закахаўся? «Мяне ўразіла твая «бітлоўская» чупрына!» — жартаўліва зазначаў музыкант... Такой жа яркай і неардынарнай атрымалася гераіня Ірыны ў «Гульні ўяўлення». Пагадзіцца адзінокай жанчыне на авантуру «быць заменай для незнаёмага мужчыны» не кожная адважыцца.


«Ах, якая жанчына...»

Але вернемся да гісторыі нашых герояў. Па сутнасці, тут для многіх крытыкаў і аматараў кіно ўсё проста: дэкарацыі малабюджэтныя, героі іграюць непераканаўча, цытат днём з агнём не знойдзеш... Так і хочацца папрасіць: спыніцеся! Бо пры ўсіх, як мне здаецца, вышэй названых недахопах гэты фільм атмасферны і па сённяшні дзень павучальны. І, можа, увесь гэты аповед зроблены ў стылі «неахайнасці» не проста так. Гэта лішні раз падкрэслівае, што галоўнае ў фільме — людзі і іх пачуцці. У гэтым выпадку — адзінота, на фоне якой зараджаецца каханне.




Прыгадаю прыпавесць. Адна сямейная пара пераехала жыць у новую кватэру. Раніцай жонка паглядзела ў акно, убачыла суседку, якая развешвала сушыцца бялізну. «Паглядзі, якая брудная бялізна...» — сказала яна мужу. А аднойчы, зноў зірнуўшы ў акно, жанчына ўзрадавалася: «О, сёння бялізна чыстая, суседка навучылася праць!», на што муж адказаў: «Проста я вымыў акно». А што калі і ў фільме мы бачым усё як адлюстраванне жыццёвых будняў, але люстэрка не памыта? І таму мы бачым дзею толькі ўрыўкамі. Ці, можа, не хочацца прызнаваць сваю недасканаласць? Альбо проста баімся сям'яцца над сабой?

Бо хіба ж не камічна, калі Маргарыта то сыходзіць, то вяртаецца ў сям'ю, з кветкамі і падарункам для сябе, жадаючы каб яе павіншаваў муж. А калі Лампасаў прапаноўвае сябраваць сем'ямі? Згодна, гэта хутчэй трагічна, што людзям так не хапае ўвагі і цеплыні іншых людзей. Дзеля гэтага яны не баяцца рабіць незразумелыя рэчы... Альбо, наадварот, адважваюцца на ўчынкі: паехаць на спатканне ў горад, дзе ваш мужчына ў камандзіроўцы, весяліцца ў вагоне метро... Словам, фільм проста лішні раз нагадвае нам, што, каб захаваць каханне, трэба рабіць учынкі і заставацца проста мужчынам і жанчынай у адносінах.

**Алена ДРАПКО.** *drapko@zviazda.by*

# ЧАСЫ. ЛЮДЗІ. УЧЫНКІ

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ І ІНШЫЯ ФІЛЬМЫ РЭЖЫСЁРА МІХАІЛА ПТАШУКА

**«Кааператыў «Палітбюро», або Будзе доўгім развітанне».** Карціна выйшла ў 1992 годзе. Паводле сюжэту, прадпрымальны малады чалавек прыдумляе кааператыў



